# Місія беларускага літаратуразнаўства і літаратуры ў кантэксце развіцця краіны





**Іван Саверчанка,**
дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, доктар філалагічных навук, прафесар

З умацаваннем суверэнітэту і незалежнасці Рэспублікі Беларусь нацыянальнае літаратуразнаўства і літаратура набылі новае прызначэнне, больш адказную грамадскую місію. Ва ўмовах глабалізацыі яны ў значнай ступені спрыяюць захаванню нацыянальнай ідэнтычнасці, забяспечваюць духоўна-культурную самабытнасць беларусаў, істотна ўплываюць на паўнавартаснае духоўна-культурнае развіццё краіны.

Літаратуразнаўства служыць навукова-метадалагічным падмуркам філалагічнай адукацыі, з'яўляецца грунтам пашырэння класічных традыцый. Лепшыя даследаванні і творы мастацкай літаратуры з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай выхавання моладзі, моцным сродкам уздзеяння на эмацыйны стан чалавека.

Шэдэўры нацыянальнага пісьменства, творы класічнай спадчыны і лепшыя здабыткі сучасных майстроў слова – незаменны фактар зберажэння гістарычнай памяці і выхавання філалагічнай культуры.

Літаратуразнаўчая навука і мастацтва слова – важныя інструменты станаўлення сучасных палітычных нацый. Яны спрыяюць грамадскай кансалідацыі, дапамагаюць умацаванню нацыянальнага адзінства, фарміруюць адчуванне прыналежнасці асобы да пэўнага соцыума, акрэсленай грамадзянскай супольнасці, дзяржавы. Як элемент культуры літаратура і літаратуразнаўства аб'ядноўваюць грамадства, скіроўваюць людзей на стваральную працу, спрыяюць усталяванню законнасці, справядлівасці, гуманнасці.

Адказнай місіяй акадэмічнага літаратуразнаўства з'яўляецца тэарэтычнае асэнсаванне гістарычнага развіцця беларускай літаратуры на працягу многіх стагоддзяў, распрацоўка метадалогіі вытлумачэння пісьмовых помнікаў даўняй і новай літаратуры.

Галоўная мэта новай падпраграмы «Літаратуразнаўства» праграмы «Сацыяльна-эканамічная і нацыянальна-культурная бяспека беларускай дзяржаўнасці» (2026–2030 гг.) – раскрыццё ідэйна-мастацкай значнасці і эстэтычнай каштоўнасці шэдэўраў беларускай літаратуры, вызначэнне місіі пісьмовай спадчыны XI–XVIII стст., устанаўленне адукацыйнага і выхаваўчага патэнцыялу мастацкай літаратуры, узмацненне яе ўздзеяння на інтэлектуальнае развіццё асобы, фарміраванне творчай фантазіі, пазнавальных здольнасцей і сістэмы маральных каштоўнасцей сучаснага чалавека. Важнейшыя задачы – выпрацоўка аб'ектыўных крытэрыяў ацэнкі якасці літаратурна-мастацкіх твораў, стварэнне дзейсных механізмаў уплыву лепшых узораў беларускай, славянскай і сусветнай паэзіі, прозы, драматургіі і публіцыстыкі на духоўна-культурную бяспеку дзяржавы, умацаванне ідэнтычнасці і маральных асноў грамадства, забеспячэнне паступальнага сацыяльнага прагрэсу і кансалідацыі беларускай нацыі, садзейнічанне міжкультурнаму дыялогу і ўзаемадзеянню славянскіх народаў, фарміраванне ўсебакова развітай, творчай, крэатыўнай і стваральнай асобы, адданай краіне і дзяржаве.

Навуковыя супрацоўнікі Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы вядуць шырокія архіўныя пошукі і рыхтуюць навукова каментаваныя выданні помнікаў беларускага пісьменства XI–XVIII стст. у арыгінальным, факсімільным і алічбаваным выглядзе, навукова асэнсоўваюць творы класікаў беларускай літаратуры XIX–XX ст. і найбольш каштоўныя ў мастацкім плане творы сучасных аўтараў, што ў поўнай меры дазволіць аднавіць і захаваць багатую пісьмовую спадчыну беларускага народа, прадставіць грамадству інтэлектуальна-творчыя дасягненні і мастацкія шэдэўры, створаныя геніяльнымі майстрамі слова на працягу стагоддзяў.

Важны напрамак работы – агульнанацыянальны навукова-пошукавы і выдавецкі праект «Беларуская класіка» ў 30 тамах; спрыянне развіццю сучаснай гістарычнай прозы, высокамастацкай паэзіі і драматургіі, дзякуючы чаму будзе забяспечана даступнасць да якасных крыніц нацыянальнай літаратуры, створаны неабходныя перадумовы для павышэння філалагічнай культуры беларускага грамадства, удасканалення маўленчых навыкаў, захавання гістарычнай памяці, экалагічнага выхавання і зацвярджэння ў грамадстве гуманістычных каштоўнасцей.

Трэба адзначыць перадавыя навуковыя распрацоўкі ключавых праблем, якія будуць вырашацца ў межах праграмы «Сацыяльна-эканамічная і нацыянальна-культурная бяспека беларускай дзяржаўнасці» (2026–2030 гг.):

- *выяўленне ролі мастацкага слова ў розныя гістарычныя перыяды, вызначэнне творчых метадаў і мастацкіх стратэгій беларускіх пісьменнікаў, раскрыццё сацыяльнай місіі і грамадскіх функцый літаратуры;*
- *даследаванне нацыянальнай літаратуры ў яе сувязях з іншымі еўрапейскімі і перш за ўсё славянскімі літаратурамі; распрацоўка і ўдасканаленне тэарэтыка-метадалагічных прынцыпаў параўнальнага літаратуразнаўства (кампаратывістыкі);*
- *усебаковае даследаванне мастацкіх здабыткаў беларускай літаратуры і іх значэння ў супрацьдзеянні небяспецы маральнай дэвальвацыі ва ўмовах камерцыялізацыі мастацтва і нарастаючай глабалізацыі;*
- *распрацоўка прынцыпаў фарміравання літаратурных жанраў і жанравых разнавіднасцей як асноўных змястоўных форм існавання літаратурных твораў, вызначэнне метадалогіі аналізу родава-жанравых прыкмет літаратурных твораў і іх залежнасці ад літаратурнага працэсу;*
- *выпрацоўка метадалагічных асноў аналізу структуры кампанентаў літаратурнага твора як цэласнай і дынамічнай у сваім развіцці мастацкай сістэмы;*
- *тэксталагічнае вывучэнне і эдыцыйная падрыхтоўка твораў класікаў беларускай літаратуры;*
- *вызначэнне перспектыў развіцця беларускага прыгожага пісьменства ва ўмовах інфармацыйнага грамадства, падтрымка тэндэнцый у развіцці нацыянальнай літаратуры, якія садзейнічаюць умацаванню інфармацыйнай бяспекі краіны.*

Важнейшы прыярытэт гісторыкаў літаратуры на сучасным этапе – выявіць творчыя метады і мастацкія стратэгіі беларускіх майстроў слова ў розныя гістарычныя перыяды, раскрыць сацыяльную місію і грамадскія функцыі мастацкага слова. Да ліку прыярытэтаў належыць асвятленне ідэйна-тэматычных гарызонтаў нацыянальнага прыгожага пісьменства і літаратуры, высвятленне эстэтычных прычын выбару аўтарамі найбольш прыдатных жанравых форм і мастацкіх сродкаў.

У наступнай пяцігодцы плануецца ажыццявіць буйныя навуковыя праекты: «Беларускае пісьменства XI–XXI стст.: аўтар – тэкст – чытач» (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар І.В. Саверчанка); «Літаратура Беларусі XX і XXI стагоддзяў: нацыянальны наратыў, самаідэнтыфікацыя і патрыятызм» (навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт А.А. Бараноўскі).

Усебаковае вывучэнне, а таксама выданне помнікаў беларускай літаратуры маюць вялікае навуковае, грамадскае, вучэбна-выхаваўчае, ідэалагічнае значэнне. Актуальнасць вынікаў даследавання заключаецца ў раскрыцці заканамернасці развіцця беларускага пісьменства ў аспекце «аўтар – тэкст – чытач», што дазволіць стварыць больш дакладную і аб’ектыўную карціну развіцця айчыннай літаратуры, а таксама паслужыць далейшаму ўмацаванню ідэалагічных асноў беларускай дзяржаўнасці, выхаванню гісторыка-патрыятычнай самасвядомасці, фарміраванню гістарычнай памяці і духоўнага патэнцыялу грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Беларускае мастацтва слова з’яўляецца ключавым энергетычным ядром духоўна-культурных працэсаў, якія ўтвараюць адзіную нацыянальную прастору

і спрыяюць росквіту сучаснай беларускай нацыі. Як важнейшая праява творчай дзейнасці, мастацкае слова адлюстроўвае багаты досвед і мудрасць нацыі, фіксуе духоўныя ўздымы і велічныя ўзлёты думкі яе лепшых прадстаўнікоў, служыць памнажэнню інтэлектуальнага патэнцыялу краіны і гуманістычных магчымасцей грамадства.

Актуальнасць даследавання тлумачыцца неабходнасцю аналізу айчыннай літаратуры як выніку агульнага неперарыўнага мастацкага працэсу: фарміраванне і пераемнасць традыцый, іх уплыў на станаўленне творчай індывідуальнасці беларускіх класікаў і новай генерацыі пісьменнікаў у гістарычным і сацыякультурным кантэкстах; а таксама здольнасцю літаратуры задаволіць імкненне сучаснага грамадства да індывідуальнай і калектыўнай самаідэнтыфікацыі ў полікультурным свеце, усведамлення неад'емнай прыналежнасці да Радзімы.

Сучасная тэорыя літаратуры ўсё больш засяроджваецца на вывучэнні феномена літаратурнага твора, выяўленні кананічных, найбольш рэпрэзентатыўных літаратурна-мастацкіх з'яў. Для кожнага перыяду літаратурнага развіцця характэрны адпаведны яму канон – сукупнасць самых важных у ідэйна-мастацкіх адносінах, вызначальных твораў, якія аказваюць найбольш прыкметнае ўздзеянне на чытацкае ўспрыманне, фарміраванне ў аўдыторыі мастацкай карціны свету. Менавіта таму плануецца ажыццявіць заданне «Беларускі літаратурны канон XVI–XXI стст.: эстэтычныя, кагнітыўныя і выхаваўчыя аспекты функцыянавання» (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, дацэнт Г.М. Кісліцына).

Тэарэтычнае даследаванне гэтага найважнейшага складніка працэсу стварэння і рэцэпцыі твораў мастацкай літаратуры будзе праводзіцца ў беларускім літаратуразнаўстве ўпершыню. Для найпаўнейшага раскрыцця ўсіх аспектаў функцыянавання дадзенага феномену неабходна вызначыць адпаведную метадалогію даследавання, выпрацаваць падыходы да аналізу кананічных літаратурна-мастацкіх з'яў у працэсе іх гістарычнай пераемнасці і развіцця. Падчас выканання праекта плануецца вырашыць шэраг прынцыповых пытанняў: якім чынам фарміруюцца літаратурныя каноны, як яны суадносяцца між сабой у розныя гістарычныя перыяды, які ўдзел у стварэнні і функцыянаванні канонаў прымае шырокая чытацкая публіка, якое ўздзеянне канон пэўнай эпохі аказвае на літаратурны працэс і інш. Канцэптуальным момантам плануемага даследавання павінен стаць сістэмна-цэласны падыход, пры якім найважнейшыя творы беларускай літаратуры будуць разглядацца ў адзінстве іх функцыянальных характарыстык.

Адна з прыярытэтных задач – тэарэтыка-метадалагічнае суправаджэнне працэсу ўзаемадзеяння беларускай літаратуры з літаратурамі іншых народаў, вызначэнне яе месца ў сусветным літаратурным працэсе. Пад асаблівай увагай будзе знаходзіцца ўсходні вектар літаратурных сувязей.

Плануецца выкананне НДР «Біблія і біблейныя сэнсы ў беларускай і еўрапейскіх літаратурах: нацыянальна-культурная і ідэйна-эстэтычная спецыфіка інтэрпрэтацыі і выяўлення» (навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт М.У. Мікуліч). Мэтай праекта з'яўляецца распрацоўка сістэмна-модульных асноў нацыянальна-культурнай і ідэйна-эстэтычнай спецыфікі інтэрпрэтацыі і выяўлення Бібліі і біблейных сэнсаў як вядучых духоўна-сацыяльных феноменаў у беларускай і еўрапейскіх літаратурах (рускай, украінскай, польскай, англійскай, італьянскай, іспанскай і інш.), раскрыццё месца і значэння літаратуры ў сістэме працэсаў духоўна-мастацкай стратэгіі сучаснага еўрапейскага грамадска-сацыяльнага развіцця і дзяржаўна-культурнага ўзаемадзеяння.

Вынікі даследавання забяспечаць напрацоўку якасна новага фактычнага матэрыялу і яго сістэмна-комплекснае абагульненне і інтэрпрэтацыю, яны будуць садзейнічаць развіццю і ўдасканаленню гісторыка-тэарэтычнай парадыгмы вывучэння беларускага нацыянальнага соцыуму, раскрыццю характэрных асаблівасцей айчыннага сацыяльна-палітычнага і грамадска-культурнага працэсаў у іх узаемадзеянні са знакавымі з'явамі еўрапейскай гісторыі і культуры, стварэнню поўнай сацыяльна-гістарычнай карты Беларусі.

На дадзеным этапе відавочна наспела неабходнасць паўнавартаснага развіцця беларускай тэксталагічнай школы, абагульненне шматгадовага вопыту беларускіх тэкстолагаў па падрыхтоўцы збораў твораў класікаў нацыянальнай літаратуры. Ад узроўню прафесійнай падрыхтаванасці спецыялістаў у многім залежыць навуковая якасць выдання класічнай літаратурнай спадчыны.

Пры падрыхтоўцы збораў твораў пісьменнікаў вырашаюцца складаныя пытанні, якія датычацца ўстанаўлення кананічнага тэксту, які ў найбольшай ступені адпавядае аўтарскай волі. Кожны том збораў твораў змяшчае дакладныя, навукова выверанныя матэрыялы, розныя тыпы каментарыяў (гісторыка-літаратурны, тэксталагічны, рэальны), якія ўключаюць звесткі пра ўсе вядомыя на момант падрыхтоўкі рукапісныя і друкаваныя крыніцы, месца першай

публікацыі і датаванне твораў, апісанне аўтографаў і аўтарызаваных машынапісаў, тлумачэнне гісторыка-літаратурных падзей.

На наступную пяцігодку тэксталагамі запланавана выданне навукова каментаванага Збору твораў Кузьмы Чорнага ў 12 т. (навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук А.А. Васілевіч). Поўны збор будзе падрыхтаваны ўпершыню, з улікам дасягненняў сучаснай навукі і эдыцыйнай практыкі апошніх гадоў. Тэксты пісьменніка будуць надрукаваны ў адпаведнасці з апошняй творчай воляй аўтара, узноўлены шматлікія купюры, зробленыя па цэнзурных меркаваннях. Упершыню будуць змешчаны моўныя варыянты і розначытанні. Падрыхтоўка да выдання новага навукова каментаванага Збору твораў Кузьмы Чорнага садзейнічае захаванню і папулярызацыі класічнай спадчыны, спрыяе сцвярджэнню высокіх гуманістычных ідэалаў і выхаванню патрыятызму ў маладога пакалення.

Важнейшы прыярытэт у дзейнасці Інстытута – развіццё акадэмічнай крытыкі з мэтай спрыяння сучаснаму літаратурнаму працэсу, аб'ектыўны аналіз шматлікіх праяў якога забяспечваюць нашы спецыялісты.

Значнае месца ў дзейнасці супрацоўнікаў Інстытута традыцыйна займае папулярызацыя лепшых здабыткаў мастацкай літаратуры – як сучаснасці, так і гісторыі. З такой мэтай рэгулярна адбываюцца выступленні на культурных мерапрыемствах – ад звычайных прэзентацый кніг да фестываляў дзяржаўнага ўзроўню (напрыклад, на Днях пісьменства), а таксама выступленні на радыё і тэлебачанні (асабліва на канале «Культура»). Крытыкі прымаюць удзел у match рознатэматычных круглых сталах і семінарах.

Немалаважную ролю ў дзейнасці Інстытута мае падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі, а таксама рэалізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на якаснае абнаўленне кадравага складу ўстановы: прафарыентацыйныя сустрэчы супрацоўнікаў з удзельнікамі студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый пры філалагічных факультэтах, прэзентацыя навуковых здабыткаў; наладжванне цесных узаемасувязей з выкладчыкамі ВНУ, якія праходзяць стажыроўку ў Інстытуце, удзельнічаюць у канферэнцыях.

Пры выкананні падпраграмы прадугледжваецца выкарыстанне штучнага інтэлекту для вырашэння тэксталагічных праблем, археаграфічнай апрацоўкі розных рэдакцый твораў падчас іх падрыхтоўкі да выдання. Дадзены інструмент будзе выкарыстоўвацца для статыстычнага і тэксталагічнага аналізу мастацкіх твораў; сістэматызацыі і каталагізацыі даных; расчытання і рэканструкцыі рукапісных і друкаваных тэкстаў; стварэння медыяматэрыялаў.

Такім чынам, акадэмічныя навукоўцы будуць асэнсоўваць дыялектыку беларускага мастацтва слова ў кантэксце славянскіх, еўрапейскіх і сусветных духоўна-культурных працэсаў, развіваць ключавыя напрамкі нацыянальнай літаратуразнаўчай навукі, спрыяць сучаснаму літаратурнаму працэсу, ажыццяўляць якасную падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі, садзейнічаць духоўна-культурнаму ўзбагачэнню беларускага грамадства і паглыбленню працэсаў мастацка-эстэтычнага выхавання грамадзян краіны. Гэта дапаможа раскрыць станаўленне і пераемнасць традыцый, іх уздзеянне на фармаванне творчай індывідуальнасці беларускіх класікаў і майстроў слова новага пакалення, пакажа здольнасць пісьменнікаў задавальняць імкненне сучаснага грамадства да індывідуальнай і калектыўнай самаідэнтыфікацыі ў полікультурным свеце. Будуць падрыхтаваны грунтоўныя індывідуальныя манаграфіі вядучых навуковых супрацоўнікаў Інстытута, у якіх падагульняецца вопыт іх працы па ключавых навуковых тэмах і напрамках. Вынікі кампаратывісцкіх даследаванняў будуць садзейнічаць выяўленню характэрных асаблівасцей айчынных грамадска-палітычных і сацыякультурных працэсаў у іх узаемадзеянні са значнымі з'явамі сусветнай гісторыі і культуры.

Навуковыя працы нашых даследчыкаў паспрыяюць якаснаму абнаўленню сучаснага літаратурнага працэса, усталяванню пераемнасці паміж класічнай традыцыяй і сучаснымі мастацка-эстэтычнымі пошукамі, паслужаць пашырэнню і паўнавартаснаму прызнанню ў свеце найбольш каштоўных здабыткаў беларускага мастацкага слова. Вынікі навуковай і творчай дзейнасці акадэмічных літаратуразнаўцаў знойдуць шырокае прымяненне ў сістэме адукацыі і культуры, паслужаць добрым грунтам пры падрыхтоўцы вучэбных праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў новага пакалення для сярэдніх школ і ВНУ рэспублікі, чытання курсаў і спецкурсаў, напісанне курсавых, дыпломных і магістарскіх работ па паэтыцы і эстэтыцы беларускай літаратуры.

Праца калектыва Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы будзе накіравана на ажыццяўленне ідэалогіі беларускай дзяржавы, а таксама духоўна-культурнае ўзбагачэнне беларускага народа, інтэлектуальнае развіццё асобы і падвышэнне філалагічнай культуры грамадства.